# ЗМЕСТ

## КАЗКІ

Аўтух-дамоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Вужыная каралева . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Казка пра Пятра-разбойніка . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Лебядзіны скіт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Мужык і дзіва аднавокае . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
З вобразаў казак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Рыбін цар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Пан тванны, шляхціц багняны . . . . . . . . . . 41
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Куцька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Вераб'ёва цешча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Старая казка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Чортаў скарб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Верабей, сава і птушыны суд . . . . . . . . . . . . . 54
Пасварыліся — памірыліся . . . . . . . . . . . . . . . 61
Бліны на дрэве, грушы на вярбе . . . . . . . . . . . 68
Скрыпка дрыгвы й верасовых пустэчаў . . . . . . 82

Кацёл з каменьчыкамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Вясна ўвосень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Жабкі і Чарапаха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Нямоглы бацька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111

## АПАВЯДАННІ

Лятучы галандзец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Завеі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
Карней — мышыная смерць . . . . . . . . . . . . . . . 180
Лясная гісторыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
Пасмяротная гісторыя аднаго цецерука . . . . . . . . . . . 223
Як звяргаюцца ідалы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251
У шалашы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 256
Кніганошы. *Навела* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 282
Сіняя-сіняя... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 306
Барвяны шчыт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 341
Вока тайфуну . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 373
Вялікі Шан Ян. *Песня пра баявыя калясніцы* . . . . . . . . 415
Былі ў мяне мядзведзі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 470
Калядная рапсодыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 508

# АЎТУХ-ДАМОЎНІК

У старога Васіля жыў за печкаю дамоўнік, які быў падобны на маленькага чалавечка. Нішто сабе, ціхмяны быў, падлоты вялікай не рабіў. А накшталт маленькіх, дык гэта не тое што дамоўнік, а і з нас іншыя здольныя.

Удзень ён ціха спаў на ложку з попелу, а ўначы пачынаў сваю нячутную тупатню па хаце і піў са сподачка малако, як вожык. Аўтухом клікалі гэтага дамоўніка. Спаў ён таксама ўсю зіму, і толькі калі пачынала страляць печка, рассыпаючы вакол залатыя іскрачкі і глытаючы ротам чурак за чураком, выпаўзаў адтуль і сядаў насупраць, саграваючы скалелыя пальцы. Гаспадыні замінае, тая яго і штурхне іншы раз, але ўзімку ён ставаў вялым і не крыўдзіўся. Затое ўлетку нават і ўдзень шпацыраваў, спаў мала, і ўжо тады не было ад яго спакою нікому. Забярэцца на стайню, выцягне стуль Варанога і гарцуе на ім да світанку. Ранкам конь увесь у мыле, дрыжыць як асінавы ліст. А Аўтух забраўся ў пуню на сена, сапе носам — і чхаў на ўсё. Стары Васіль таму сыну, што на стайні начаваў, аплявух надае: чаму не даглядаў. Вось сын

і раззлаваўся на Аўтуха, вырашыўшы яму якнебудзь адплаціць.

Аднойчы бачыць: сядзіць Аўтух на верхняй перакладзіне лесвіцы, якую да плота паставілі, шчыпле з бузіны чырвоныя гроны і ўплятае са смакам, напіхвае за абедзве шчакі.

Старэйшы сын падкраўся ззаду і адпіхнуў лесвіцу ад яго. Тая ў паветры зрабіла паўкруг. Аўтух наверсе вісіць, верашчыць, нагамі дрыгае: вельмі спудзіўся.

М-м-мяк-к!

Ляснуўся аб зямлю, лесвіцай яго зверху прыціснула, варочаецца і крэкча.

А справа была за камяніцаю, вакол дурнап'ян, крапіва проста гаем расце, злосная, як сабака. А Аўтух жа голы, варочаўся, круціўся, неяк выпаўз — і бегчы, не памятаючы сябе. Бег, бег і знянацку ўскочыў у дзежку з гнаёваю жыжаю для гароду. Выдрапаўся стуль увесь зялёны з галавы да ног. Старэйшы сын за плотам — ну рагатаць. Да таго часу рагатаў, пакуль Аўтух усяго не зразумеў...

Вось увечары гаспадыня прыйшла і калі ўвайшла ў пакой — там ляжаў Аўтух на белых узгалоўях.

Ляжыць, з боку на бок перакочваецца з насалодаю. Як вылез з дзежкі, дык і пайшоў лёг.

Адпомсціў!

*1952, Орша, в. Руклі*

# ВУЖЫНАЯ КАРАЛЕВА

Ці далёка ці блізка, ці нядаўна ці даўно, на той самай зямлі, на якой мы жывема, дагэтуль жылі нашы дзяды — было ўсё гэта.

Стаяла на беразе хата старога Яся, стаяла з краю пачынка. А Ясь жыў тут даўно, пасівелі яго валасы, як грушавы квет, і жонка яго ўжо ў зямлю расці пачынала. Вырасцілі яны двух сыноў і дужа дачку хацелі мець, а яе не было. Тужылі яны, тужылі, ды тугою справе не паможаш.

Толькі раз неяк пайшла старая Ясіха да блакітнага возера, сядзела на яго беразе ды ненарокам і заснула. Сніць яна, быццам звесіўся з галін дрэва вуж з залатою каронаю на галаве, трымае ў роце блакітную кветку і кажа:

— Бяры, маці, кветку. Толькі глядзі: спарадзіш дачку — аддай яе мне ў жонкі.

І быццам бы кажа яна яму:

— Дзякую за падарунак-кветку, вуж — залатая галава. Толькі як жа ж без дачкі рашаць. Хай сама рашае...

Прачнулася — у руцэ сіняя кветка зацiснута. Мусіць, са сну адарвала. Ці праўду казаў вуж, ці няпраўду, а не паспеў Ясь збіць і пары поршняў[1]

[1] Абутак з кавалка ялавай або свіной сырамятнай скуры, сабранай на ступні абораю. — *Заўв. рэд. (тут і далей, акрамя адмыслова агавораных выпадкаў).*

з самай тонкай скуры, як нарадзілася ў іх дачка, і празвалі яны яе Ялінаю.

Ляцелі гады над лесавою хаткаю, як белыя лебедзі, праходзілі сівыя дні зімы і чырвоныя летнія дні. Расла дзяўчынка: крыніцы ёй ваду давалі, завірухі румянілі, сонейка саграvала.

Расла і выраўнялася ў красуню, якой нат у нашых лясах не знайсці, не адшукаць. Статная, як яліна, вочы як бездань блакітная, валасы залатыя, вусны чырвоныя. Біліся за яе ўжо хлопцы, не шкадуючы сябе. Красуняю была Яліна.

Дзень летні пячэ, смуга над зямлёю калыхаецца. Пайшла Яліна з сяброўкамі да Сіняга возера купацца. А і там усё спіць, нават стракозы селі на чарацінах і скрыдлышкі склалі. Гарачыня!

Скупаліся сяброўкі, клічуць яе за сабою, а яна замарудзілася. Тыя ўжо і на адхіл узышлі, калі выбралася яна з вады і кінулася да вопраткі. Аж бачыць: ляжыць у яе андараку[1] вуж і галаву адтуль выставіў:

— Аддай мне, вуж, мой андарак.

— Не, не аддам. Прымі ў нядзелю маіх сватоў — тады аддам.

Няма чаго рабіць, давялося паабяцаць.

— Пакляніся, Ялінка.

— Ну добра-добра. Клянуся.

— Добра ж.

[1] Андара́к — саматканая паласатая або клятчастая спадніца.

# ЗАВЕІ

На фінскую вайну мяне ўзялі на другі дзень пасля вяселля.

Дваццаць кіламетраў ехалі мы да нашай станцыі Вальшанкі, і ўсе дваццаць кіламетраў жонка сядзела поруч са мною ў машыне як закамянелая. Я просты чалавек і не вельмі веру ва ўсе гэтыя вашы раманы-аповесці. Надта ўжо хораша ў іх пра каханне пішуць. Але жонку мне было шкода кідаць.

І было мне крыўдна. Жонка мая не з нашай вёскі, не з Андрэеўшчыны была, а аж з Пятроўскіх выселкаў, яшчэ на пятнаццаць вёрст ад станцыі далей, ніж мы. І на веласіпедзе, і пехтуром, і на папутных машынах, і ў спёку, і ў асеннія дажджы, і ў сцюжу. Бо я да яе аж паўтара года заляцаўся, надта ўжо яна мне прыемнай была.

А яна за мяне замуж не хацела выходзіць: я чалавек не авантажны, морда ў мяне, самі бачыце, рэшатам не накрыеш, хоць я здаровы, моцны і працу добрую маю, шафёрам працую. Толькі не мог я з ёю размаўляць, як іншыя. Кастусь-гарманіст, дык той, бывала, і пінжак на плечы, і «ласачка ты мая, ясачка ты мая гожая, ружа ты мая прыўкрасная». А я больш маўчу, стаю, як хомка, або размаўляю пра жыта, якое яно стала добрае і што ў ім з галавою схавацца можна. Некаторыя дзяўчаты нават

крыўдзіліся: думалі, што я нахаба. Ну, аднак надта ўжо я настойлівы быў — выйшла за мяне.

Я амаль усю дарогу да Ленінграда ехаў як дурны. Усё мне яна перад вачыма на пероне: вусны чырвоныя, спакойныя, а вочы плачуць, хоць слёз няма. І такая яна ціхая-ціхая, пакорлівая, як ніколі. А то вясёлая была, першая плясуха на вёсцы. І ціха так кажа:

— Беражы сябе, Васіль. Не лезь на кулі.

Хацеў я ёй напомніць, як яна мяне ў свой час «слупом неадгабляваным» называла і рот мой са студняй параўноўвала і казала, што я на вочап падобны, і як хустку мне на галаву нацягвала перад сяброўкамі, — пашкадаваў, не сказаў.

Нашто гэта патрэбна — чалавека на другі дзень пасля вяселля пад кулі цягну́ць, — дагэтуль не ведаю.

Ваявалі. Паўзеш па гурбах, а ён, падлюка, сядзіць на дрэве і з вінтоўкі ў цябе «пяк, пяк». Іншы торкнецца галавою ў снег і ляжыць сабе на зямлі, гатовенькі для брацкай магілы.

А я паўзу і пра яе думаю, страляюць у мяне — пра яе думаю, пад ялінаю ў гурбе сплю — пра яе сню. Усё мне ўяўляецца, быццам яна па вёсцы ідзе з торбачкаю — запрашае ўсіх на вяселле і піражок кожнаму працягвае, — або як на вяселлі сядзім мы, як ёлупы, за руку звязаныя, або як я сяджу ў суседнім пакоі і куру, а за дзвярыма яе туфлі на падлогу падаюць. А сэрца маё, як матор, грукае. Я зусім

шчанюк быў, да яе нікога не ведаў, да таго самага вяселля.

І зноў яна па снягах ідзе і смяецца.

У мяне не любоў была, як у раманах, усё не так. Я яе не любіў так, але ж на другі дзень пасля вяселля ўзялі! Звар'яцеў я проста, хаджу як зачумелы які.

Але ўсяму прыходзіць канец. Вайне таксама. Кончылася яна, але нас не адпусцілі, а ўсе нашыя часці пачалі пераганяць да эстонскай мяжы, кудысьці на бераг Чудскага возера. Водпускаў не даюць, чаму — невядома. Пацягнуў мяне д'ябал напісаць ёй ліст ці сказаць, што добра было б, калі б адпусцілі мяне дні на тры ў водпуск, бо мы тады яшчэ ў Ленінградзе адпраўкі чакалі. І чакалі мы яе з гадзіны на гадзіну, нават ад эшалонаў не вельмі адпускалі. Атрымаў я адказ.

«Дарагі ты мой Вася! Нават калі і адпусцяць дні на тры — не прыязджай, бо зіма сам ведаеш якая. У нас увесь час завеі, на станцыю ніхто ані нагою, вёску ўсю да стрэх замяло, і нават я з фермы амаль не іду, бо дахаты не заўжды дабярэшся. Проста не зможаш ты за тры дні дабрацца. Не пакутуй толькі. Я часта думаю, якая я дурная была, што не хацела ісці за цябе. Цяпер нас ніхто не разлучыць, бо я многа зразумела і часта начамі не сплю, а каб здрадзіць табе, дык пра гэта і не думай. Але не прыязджай, хоць я тысячу разоў цалую цябе ў твае вусны...»

І гэтак далей на трох старонках. Дурная, думаю, вядома, у мае вусны цалуеш, у чые ж яшчэ. Паспрабавала б яшчэ цалаваць камусь — я б тады ўсю вёску дагары нагамі перавярнуў.

І разабрала мяне злосць. Як гэта «не прыязджай», як гэта «не дабяруся». Адпусцілі б толькі.

І пайшоў да камандзіра роты, бо ўстава не ведаў, а, праўдзівей, таму, што ўзводны наш быў чалавек чэрствы. Усё яму расказаў. Той павагаўся трохі, а потым зрабіў злачынства па службе. Кажа:

— Дабярэшся за тры дні?

— Трэба паспрабаваць, — кажу.

— Д-добра, душа цёмная. Сам гэта ведаю, давай адрас. Бачыш, яшчэ не адпраўляюць нас, але кожную гадзіну могуць адправіць. Дык вось паязджай, хутчэй толькі паязджай. А я табе тэлеграму дам, і ты абяцай, што па першай тэлеграме выедзеш і нас дагоніш, каб на месца мы з табою ўжо прыехалі. Згода?

— Згода, — кажу цвёрда. — Дзякуй вам. Я вас не падвяду.

І паехаў я. А зіма была ў той год сапраўды такая, што людзі па хатах сядзелі, цягнікі на суткі спазняліся па прычыне завеяў і хаты заносіла да самых стрэх.

Паехаў я. Узяў з сабою чамадан з падарункамі і паехаў. На восем гадзін спыніўся мой цягнік, і выйшаў я на станцыі Вальшанцы надвячоркам, гадзін у шэсць вечара. Выйшаў — і як у малако